Важное значение в формировании личности будущего педагога имеет чтение иноязычной литературы по специальности и профессиональная беседа. Чтение спецтекстов дает возможность создать точную и полную информационную основу профессиональной деятельности специалиста, которая, в свою очередь, делает его труд высокоэффективным. Профессионально-ориентированная беседа рассматривается как целостный коммуникативный акт, характеризующийся обязательным наличием конечной цели и предполагающий целенаправленный обмен информацией по определенной теме. Поощряется творческий подход к подбору материала, активное участие в обсуждении, информативность высказываний, выражение собственного мнения.

Наряду с подготовкой компетентных и высоко профессиональных специалистов одной из задач вузовского образования является воспитание достойных и уверенных в своих силах людей. Необходимо воспитывать нравственные качества личности, присущие учителю и воспитателю, который будет относиться к своим ученикам с уважением и ценить их индивидуальность.

## Камунікатыўная кампетэнцыя дашкольнікаў як паказчык якасці адукацыі

*Дз. М. Дубініна (г. Мінск)*

Адукацыйны стандарт прадугледжвае забяспячэнне якасці выхавання і навучання дзіцяці з улікам яго ўзроставых і індывідуальных асаблівасцей і зарыентаваны на працэс пераемнасці дашкольнай і пачатковай адукацыі, яе вынік. Менавіта адукацыйны стандарт выступае ў якасці гаранта базавай дашкольнай адукацыі дзяцей дашкольнага ўзросту і забяспечвае падрыхтаванасць выхаванца дашкольнай установы да адукацыі на наступным ўзроўні – ў пачатковай школе.

Пад базавым кампанентам дашкольнай адукацыі навукоўцы разумеюць пэўную ўзроставую ступень кампетэнтнасці дзіцяці. Пры гэтым ступень кампетэнтнасці разглядаецца як комплекс базавых асобасных характарыстык, патрэб і здольнасцей, сістэма ведаў і неабходных уменняў і навыкаў; якасных псіхалагічных новаўтварэнняў узроста, якія дазваляюць дзіцяці арыентавацца ў навакольным асяроддзі і рэалізоўваць свае патрэбы. Базавы мінімум ведаў, уменняў, навыкаў дзіцяці дашкольнага ўзросту разглядаецца сучаснымі навукоўцамі (Л. А. Парамонава, М. М. Паддзьякаў) як складаная інтэграваная адзінка, як поліаспектная з'ява, якая састаўляе сукупнасць разнастайных кампетэнцый .

Адной з асновапалагаючых састаўных частак базавага кампаненту выступае камунікатыўная кампетэнцыя (А. А. Андрыеўская, Б. Крафт, К. Менг і інш.), якая ахоплівае моўную і маўленчую кампетэнцыі.

У лінгвістычных даследаваннях адзначаецца, што моўная кампетэнцыя – гэта веданне мовы і валоданне ёй, моўная кампетэнцыя прадугледжвае наяўнасць здольнасці чалавека да паспешнай камунікацыі, заснаванай на яго ўзроўні валодання мовай і моўнымі нормамі, на яго ўменні прадуцыраваць і разумець тэксты розных тыпаў.

Пад маўленчай кампетэнцыяй А. М. Богуш разумее ўменне дзіцяці адэкватна і слушна практычна карыстацца роднай мовай ў канкрэтных сітуацыях зносін, выкарыстоўваючы з гэтай мэтай маўленчыя, немаўленчыя (міміка, жэсты, рухі) і інтанацыйныя сродкі выразнасці маўлення ў іх сукупнасці.

Маўленчая кампетэнцыя вызначаецца колькасна-якаснамі характарыстыкамі фанетычнай, лексічнай, граматычнай, дыяманалагічнай кампетэнцый. У сваёй сукупнасці яны састаўляюць камунікатыўную кампетэнцыю, якая характарызуецца як комплекснае выкарыстанне маўленчых і немаўленчых сродкаў з мэтаю рускамоўных і беларускамоўных зносін у канкрэтных сацыяльна-бытавых сітуацыях, уменне арыентавацца ў сітуацыях зносін, ініцыятыўнасць зносін.

Змест маўленчай кампетэнцыі дашкольніка на розных ўзроставых этапах прадстаўлены ў нацыянальнай праграме «Пралеска», а яе метадычны бок – у шэрагу вучэбна-метадычных дапаможнікаў для педагогаў дашкольных устаноў.

На момант заканчэння дашкольнай установы і паступлення ў пачатковую школу розныя віды маўленчай кампетэнцыі выпускніка дашкольнай установы вызначаюцца наступнымі колькасна-якаснымі характарыстыкамі.

Лексічная кампетэнцыя ўяўляе сабой наяўнасць багатага слоўнікавага запасу на аснове паглыблення ведаў дзяцей аб прадметах і з'явах навакольнага свету, фарміравання і дыферэнцыяцыі паняццяў. Дашкольнікі разумеюць такія моўныя з'явы, як антанімія, сінанімія, мнагазначнасць, актыўна выкарыстоўваюць іх у мове. У размове дзеці старэйшага дашкольнага ўзросту ўжываюць словы ў адпаведнасці з іх значэннем. Колькасная і якасная характарыстыка слоўніка дашкольніка адпавядае ўзроставай норме.

Граматычная кампетэнцыя вызначаецца ўменнем дзяцей ужываць у выказваннях розныя тыпы сказаў (простыя, складаныя, з простай мовай), асэнсаванымі адносінамі да граматычнай правільнасці маўлення, авалодваннем спосабамі словаўтварэння дзеясловаў, назоўнікаў, прыметнікаў, "эксперыментаваннем" са словам, яго гукавой абалонкай.

Фанетычная кампетэнцыя разглядаецца як правільнае вымаўленне усіх гукаў роднай мовы, уменне адрозніваць на слых і ў вымаўленні блізкія ў акустычных і артыкуляцыйных адносінах гукі – зычныя свісцячыя, шыпячыя, санорныя (с-з, ш-ж, с-ш, л-р і інш) цвёрдыя і мяккія (л-ль, с-сь), звонкія і глухія (д-т, б- п і інш); выразнае і дакладнае прагаворванне чыстагаворак, скорагаворак, кароткіх вершаў; асэнсаванне складовай будовы слова, славеснага складу сказа, наяўнасць ўменя падбіраць словы з названым гукам, блізкія па гучанні, сфарміраванасць навыкаў карэкцыі і самакарэкцыі маўлення.

Дыяманалагічная кампетэнцыя прадугледжвае наяўнасць умення наладжваць размову з аднагодкамі, дарослымі; падтрымліваць дыялог ў адпаведнасці з тэмай, валоданне ўменнем састаўлення апісальных і сюжэтных апавяданняў (па цаццы, карціне, набору цацак, па сюжэтных карцінках); пераказвання тэкста; адэкватнае выкарыстанне маўленчых і паралінгвістычных сродкаў выразнасці, валоданне формуламі маўленчага этыкету

Па меркаванні А. А. Лявонцьева, у любым маўленчым выказванні праяўляецца цэлы шэраг уменняў: хуткая арыентыроўка ва ўмовах зносін, уменне планаваць сваё маўленне і выбіраць змест, знайсці моўныя сродкі для перадачы і умець забяспечыць адваротную сувязь, інакш зносіны будуць неэфектыўнымі і не дадуць жадаемых вынікаў.

Маўленчая кампетэнцыя дзіцяці ўключае валоданне як рускім, так і беларускім гутарковым маўленнем, арыентацыю дзіцяці ў сітуацыі зносін і самастойнае вынаходніцтва маўленчага рашэння ў новай сітуацыі, творчае выкарыстанне вядомага маўленчага матэрыялу (лексіка, граматычныя формы, вымаўленчыя нормы).

Засваенне маўлення на рускай і беларускай мовах у межах базавага кампаненту дашкольнай адукацыі з'яўляецца неабходнай умовай вырашэння задач разумовага, эстэтычнага і маральнага выхавання дзяцей ў найбольш сензітыўны перыяд іх развіцця.

Ф. А. Сахін разглядаў узаемасувязь маўленчага і разумовага аспектаў авалодвання м вай у дашкольным дзяцінстве ў сувязі з развіццём мыслення дзіцяці. У старэйшага д кольніка перавагае наглядна-вобразнае і славесна-лагічнае мысленне. Апошняе паст становіцца вядучай формай мысліцельнай дзейнасці. З яго развіццём развіваецца інтэ альная функцыя мовы. Па меркаванні Ф. А. Сахіна, існуе і адваротная сувязь, якая разг роль інтэлекту ў авалодванні мовай, выступае як аналіз моўнай (лінгвістычнай) ф інтэлекту.

Найбольш гэтую сувязь магчыма прасачыць у фарміраванні звязнага маўлення дзі Для таго, каб звязна расказаць пра што-небудзь, неабходна ясна ўяўляць аб'ект распов умець аналізаваць, устанаўліваць розныя адносіны паміж прадметамі і з'явамі, неабход валодаць навыкамі пабудовы звязнага выказвання: падбор найбольш прыдатных слоў дл выражэння пэўнай думкі, пабудова простых і складаных сказаў, выкарыстанне р сродкаў для сувязі сказаў і розных частак выказвання.

Навучанне дашкольнікаў роднай мове цесна звязана з маральным выхаваннем да кольнікаў. Родная мова з'яўляецца і сродкам, і зместам духоўнага развіцця малень дзіцяці. Па зазначэнні Я. Коласа, «скрозь адчыненыя дзверы роднай мовы льецца... шы кая, магутная плынь... людкуючы розум і пачуцці дзяцей» [1, с. 319]. Семантычнае ўзб чэнне слоўніка дашкольнікаў спрыяе засваенню імі груп слоў, якія абазначаюць маралі якасці чалавека, яго эмацыянальныя станы, ацэнку яго учынкаў.

У час расказвання ў дзіцяці фарміруюцца не толькі маральныя веды, але і маральн паводзіны, культура маўленчых зносін.

Праз родную мову дашкольнікі выхоўваюцца эстэтычна. Яны спасцігаюць характ багацце мовы, уключаюць у сваё маўленне словы, якія абазначаюць эстэтычныя якасц ацэнкі, прыгожыя вобразныя і трапныя выразы. Асэнсаваныя адносіны дзіцяці да мовы ў эстэтычнай функцыі найбольш ярка праяўляюцца ў працэсе творчага расказвання. Д ўзнаўлення задуманага вобраза дашкольнік выбірае пэўныя выяўленча-выразныя мас тацкія сродкі.

Звязнае выказванне адлюстроўвае як узровень валодання багаццем роднай мовы, т і ўзровень разумовага, маральнага, эстэтычнага і эмацыянальнага развіцця дзіцяці.

Такім чынам, высокі ўзровень развіцця маўлення дашкольніка, яго камунікатыўная кам петэнцыя ўключае:

- валоданне літаратурнымі нормамі і правіламі роднай мовы, свабоднае выкарыста лексікі і граматыкі пры выражэнні сваіх думак і састаўленні любога тыпу выказвання;
- наладжванне размовы ў адпаведнасці з канкрэтнай сітуацыяй, асэнсавання і разумен тэмы і зацікаўленасці;
- развітую культуру зносін, выкарыстанне маўленчых і паралінгвістычных сродкаў выраз насці, уменне ўступаць у кантакт з дарослымі і аднагодкамі: выслухоўваць, адказваць, пы тацца, тлумачыць;
- веданне нормаў і правіл маўленчага этыкету, уменне карыстацца імі ў залежнасці ад сіту ацыі: праяўляць ініцыятыву або карэктна заканчваць размову;
- самастойнае састаўленне апавяданняў рознага віду, пераказванне мастацкіх тэкстаў;
- уменне чытаць (элементарнае валоданне граматай).

*Літаратура:*

1. Колас Я. Збор твораў: У 14 т. Мн., 1990. Т. 12.